УДК 94(476)
**Л. Ю. МАЛЫХІНА**
Беларусь, Брэст, БрДТУ

# ПАЛІТЫЧНЫ ДЗЕЯЧ І ЛІТАРАТАР ЯЗЭП ВАРОНКА

У 2018 г. мы святкуем 100-годдзе нараджэння беларускай дзяржаўнасці – спачатку ў форме Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), напрыканцы 1918 г. – БССР. Па гісторыі гэтага перыяду за пройдзенае стагоддзе выдадзена нямала навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, матэрыялаў у масмедыя. Але ж нярэдка па-за межамі навуковага даследавання застаюцца асабістыя лёсы непасрэдных удзельнікаў гістарычных падзей, змагароў за ажыццяўленне беларускай нацыянальнай ідэі. Наша невялікае даследаванне прысвячаецца выдатнай асобе – вядомаму беларускаму палітычнаму дзеячу, журналісту, публіцысту Язэпу Варонку, які ў 1918 г. стаў кіраўніком першага беларускага ўрада – Народнага сакратарыята. Прадметам даследавання стала яго палітычная, грамадская і літаратурная дзейнасць на працягу ўсяго жыцця.

Язэп Варонка нарадзіўся 4 красавіка 1891 г. у мястэчку Кузніца Сакольскага павета Беластоцкага ваяводства Расійскай імперыі, якое цяпер знаходзіцца на польска-беларускай мяжы. Дзіцячыя гады Язэпа прайшлі на Беласточчыне, а вось юнацтва, калі ён набіраўся палітычнага вопыту, – у Санкт-Пецярбургу. Там Язэп спачатку быў вольным слухачом юрыдычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта, адкуль пазней быў выключаны ў 1914 г. за неўнясенне платы за навучанне. Адначасова ён супрацоўнічаў з пецярбургскімі газетамі “Столичные вести”, “Воскресная вечерняя газета” і часопісам “Зритель”, дзе друкаваў свае вершаваныя творы пад псеўданімам Юрый Вегаў.

В. Ункоўскі ў рускім часопісе “Возрождение” (Парыж, жнівень, 1956 г.) пісаў: “Сакратаром рэдакцыі быў сімпатычны студэнт-юрыст Пецярбургскага ўніверсітэта Язэп Якаўлевіч Варонка – беларус з Беластока. Высокі прыгожы брунет, ён хадзіў не ў сціплай тужурцы, а ў адмыслова пашытым студэнцкім сурдуце, зашпіленым на ўсе гузікі. Падкрэслена запаволены, заўсёды чыста паголены, валасы на прабор і нязменная памада. Ужываў дарагую мужчынскую парфуму й добра знаўся з ёю”.

З 1917 г. Язэп Варонка пачынае сур’ёзна займацца палітыкай. Ён уступае ў Беларускую сацыялістычную грамаду, з чэрвеня 1917 г. становіцца членам яе Цэнтральнага камітэта. Я. Варонка прадстаўляў беларускія арганізацыі ў Асобай нарадзе для выпрацоўкі палажэння аб выбарах ва Усерасійскі ўстаноўчы сход, удзельнічаў у рабоце Дзяржаўнай нарады ў жніўні 1917 г. у Маскве.

У прадмове на Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе ў верасні 1917 г. у Петраградзе ад імя Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый выказаўся супраць урадавай кааліцыі сацыялістычных партый з буржуазнымі. У той жа пераломны год малады палітык уваходзіў у склад Часовага савета Расійскай рэспублікі (Перадпарламента), да снежня ён узначальваў камітэт Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны.

На II сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый у кастрычніку 1917 г. у Мінску Я. Варонка падтрымаў прапановы аб увядзенні аўтаноміі Беларусі явачным парадкам і быў абраны камісарам юстыцыі і ўнутраных спраў Вялікай беларускай рады. Пасля падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага з’езда ў снежні 1917 г., які, як вядома, быў разагнаны. Менавіта ў гэты час праявіліся здольнасці Язэпа Якаўлевіча да арганізацыйнай і палітычнай работы. Я. Варонка заўсёды адрозніваўся правадырскімі якасцямі, на што не ўсе пагаджаліся. Ішоў працэс стварэння першай беларускай палітычнай эліты.

21 лютага 1918 г. члены выканкама Усебеларускага з’езда выдалі Першую Устаўную грамату, згодна з якой быў створаны першы беларускі ўрад – Народны сакратарыят Беларусі.

Я. Варонка прабыў на пасадзе старшыні гэтага сакратарыята і працаваў аднačасова народным сакратаром замежных спраў з лютага да ліпеня 1918 г., што з’яўляецца вялікай заслугай Варонкі, хаця пасля яго на гэтай пасадзе змянілі іншыя. Варонка быў адным з галоўных ініцыятараў абвяшчэння БНР, стаў членам Рады БНР.

У красавіку 1918 г. разам з іншымі актывістамі Рады БНР Я. Варонка падпісаў тэлеграму кайзеру Вільгельму II з падзякай “за вызваленне Беларусі нямецкімі войскамі ад цяжкага прыгнёту, гвалту і анархіі”.

Я. Варонка рэдагаваў часопіс “Варта”. З канца 1918 г. арыентаваўся на Літоўскую тарыбу, разглядаючы яе як натуральнага саюзніка ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць.

У снежні 1918 – красавіку 1920 г. Я. Варонка быў прызначаны міністрам беларускіх спраў і са згоды іншых дзеячаў БНР стаў членам кабінета міністраў Літвы. Там ён пачынае ствараць адзін з цэнтраў улады на беларускай частцы, якую тады Літва лічыла сваёй, а ў гэтую рэспубліку ў выніку дамоваў з немцамі ўваходзіла і Беласточчына.

Адзін з тагачасных вершаў “На Нёмане” (1921) прысвячаецца аўтарам роднай Бацькаўшчыне.

**На Немане**

*«На реках Вавилонских тамо седехом»*
*Псалом 137*

Безмолвно, день и ночь, без ропота и стона
Я слушаю и жду твоих, гонец, вестей,
Когда придут оне из царства Вавилона,
С заглохших пепелищ, с унылых площадей...
Но ты, о Неман мой, загадочно-угрюмый,
Молчишь в своих крутых зеленых берегах,
От слуха моего тая лихия думы,
И вести громкия, и радости, и страх.
Быть может там, средь нив и пущ завороженных,
Где кровью братскою напоены снопы,
Уже проснулся он, страдалец миллионный,
Уже отогнуты и косы, и серпы;
Уже понесся клич, заговорили горны...
Скажи, все это есть? Немой, заговори!
И миру расскажи, что после ночи черной
Увидели и мы лучи своей зари [3, с. 2].

Пасля завяршэння падзей польска-савецкай вайны, калі Вільня ўвайшла ў склад Літоўскай Рэспублікі, Я. Варонка быў вымушаны рухацца далей на захад. Апанаваны роспаччу беларускі нацыянальны дзеяч друкуе новы верш.

**Вильне**

Когда я вновь тебя увижу,
Когда твой шум услышу я?
О, ни к Берлину, ни к Парижу
Так не влечет любовь меня.
Твоих обветрившихся готик,
И серых базильянских стен,
Мне не заменит крик экзотик
И арок чужеземных плен...
Вот, вот мы будто близко, близко,
У гедиминовых руин...
Тебя рабыней, одалиской,
Надменный сделал властелин?!
Нет, не прошу твои я стоны,
Людскую совесть разбужу,
Свои я кликну легионы,
И родину освобожу [4, с. 2].

Як лідар Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў Я. Варонка з лістапада 1922 г. становіцца старшынёю таварыства "Беларуская грамада ў Каўнасе", займаецца выдавецкай і публіцыстычнай дзейнасцю. У гістарычна-публіцыстычных працах ён абагульняў асноўныя факты з гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, аналізаваў тагачаснае палітычнае становішча. Прытрымліваўся канцэпцыі "двух ворагаў" беларускага адраджэння – Расіі і Польшчы, адмоўна ацэньваў палітыку ў нацыянальным пытанні як Часовага ўрада Расіі, так і Савета народных камісараў. У яго інтэрпрэтацыі Усебеларускі з'езд – гэта Устаноўчы з'езд, які ўвёў у межах Беларусі рэспубліканскі лад, замацаваў права народа на зямлю і інш.

У нарысе Я. Варонкі "Беларускі рух ад 1917 да 1920 году" аўтар апісаў дыпламатычныя ўзаемаадносіны Рады БНР і Літоўскай тарыбы, прыгадваў дзейнасць дыпламатычных консульскіх прадстаўніцтваў у Кіеве, Адэсе, Стаўрапалі, Вільне і Маскве, распавядаў аб рабоце Надзвычайных місій у Кіеве, Варшаве, Берлине, Капенгагене [2].

Ухваляючы абвяшчэнне БНР, утварэнне БССР публіцыст разглядаў як палітычны манеўр, з дапамогай якога бальшавікі імкнуліся "авалодаць розумамі элементаў, што нацыянальна адрадзіліся". Адначасова асуджаў захоп Беларусі войскамі Польшчы, паказваў крывадушнасць палітыкі польскіх акупантаў, выкрываў іх бясчынствы ў дачыненні да мясцовага насельніцтва. У сваёй кніжцы "Беларускі рух..." Я. Варонка сур'ёзна ўзняў пытанні роднай мовы, адносіны да яе палякаў, рускіх і немцаў. Ён пісаў: "*Расейскія русыфікатары лаялі беларускіх дзеячоў за тое, што яны «польскія найміты» і так далей, але ў той самы час палякі ўсюды выступалі процi таго, каб ніякім спосабам не ўводзіць беларускай мовы ў касцёле, бо гэта ёсьць пераход да маскалёў і схызматыкаў. Такім чынам і з аднаго і з другога боку беларускую справу залічалі то да польскай, то да маскоўскай інтрыгі, але фактычна ні адна з гэтых старон справе не дапамагала... А вось немцы падавалі вялікія надзеі ў дапамозе адраджэньню беларускае культуры і распаўсюджэньню беларускага руху. Не можна ўпусьціць з вока таго факту, што фэльдмаршал Гіндэнбург першы ў пачатку 1916 года асобным расказам аб'явіў беларускую мову ў старой акупацыі мовай раўнапраўнай іншым мовам у краі: літоўскай, жыдоўскай і польскай. Пры немцах на беларускай мове друкаваліся адозвы, пашпарты, падтрымліваліся беларускія школы, школьныя выдавецтва...*" [2].

У 1923 г. Я. Варонка пакінуў Беларусь і эмігрыраваў у ЗША, дзе і пражыў усё сваё астатняе жыццё (памёр 4 чэрвеня 1952 г.). Там наш суайчыннік быў адным з пачынальнікаў беларускага палітычнага руху сярод прадстаўнікоў дыяспары. Ён узначальваў Беларуска-амерыканскую

нацыянальную асацыяцыю, выдаваў газету, арганізоўваў і вёў беларускія і рускія праграмы на чыкагскім радыё. Больш шчыра пра амерыканскі перыяд жыцця Я. Варонкі напісаў у сваёй кнізе Вітаўт Кіпель: “Язэп Варонка быў выдатным пачынальнікам і кіраўніком беларускага руху ў Злучаных Штатах. Ён прыехаў у гэтую краіну зь ініцыятывы Янкі Чарапука як прадстаўнік Рады БНР. Я. Варонка да свайго прыезду ў Злучаныя Штаты меў ужо значны досьвед палітычнага кіраўніцтва, займаючы пэўны час сярод іншага пасаду прэм’ер-міністра Беларускае Народнае Рэспублікі. Ён быў высокаадукаваным чалавекам. Ён адыграў значную ролю ў грамадскім і палітычным жыцьці амэрыканскіх беларусаў, а ягонае непахіснае жаданьне заснаваць магутную беларускую арганізацыю заслугоўвае ўсялякае павагі…” [7].

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Варонка, Я. Беларуская справа да міравой нарады ў Вэрсалі. Гістарычна-палітычны нарыс / Я. Варонка. – Коўна : Т-ва імя Ф. Скарыны, 1919.
2. Варонка, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году. Кароткі агляд / Я. Варонка. – Коўна : Т-ва імя Ф. Скарыны ; друк. А. Бака і Х. Манкес. – 1920. – 34 с.
3. Вегов, Ю. На Немане / Ю. Вегов // Зеркало. Журн. лит., искусства, сатиры и обществ. жизни. – 1921. – № 1 (29 июля). – С. 2.
4. Вегов, Ю. Вильне / Ю. Вегов // Зеркало. Журн. лит., искусства, сатиры и обществ. жизни. – 1921. – № 2 (3 сент.). – С. 2.
5. Воронко, И. Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции. Историко-политический очерк / И. Воронко. – Ковна, 1919. – 59 с.
6. Імёны Свабоды: Язэп Варонка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.google.by/amp/s/www.svaboda.org/amp/770433.html. – Дата доступу: 16.12.2018.
7. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск, 1993.
8. Латышонак, А. У Язэпа Варонкі былі правадырскія замашкі [Электронны рэсурс] / А. Латышонак. – Рэжым доступу: https://www.racyja.com/kultura/aleg-latyshonak-u-yazepa-varonki-byli-pr/. – Дата доступу: 25.11.2018.
9. Міхалюк, Д. Урад БНР Язэпа Варонкі: унутры- і знешнепалітычная дзейнасць / Д. Міхалюк // Паліт. сфера. – Вільня, 1912. – № 18–19 (1–2). – С. 203–219.
10. Руднева, С. Е. Демократическое совещание (сентябрь 1917 г.): История форума / С. Е. Руднева. – М. : Наука, 2000. – С. 151–153.
11. Сідарэвіч, А. Знойдзеная магіла кіраўніка ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі Язэпа Варонкі / А. Сідарэвіч // Наша Ніва. – Мінск, 2018. – 25 лют.
12. Язэп Варонка і Рада Беларускай Народнай Рэспублікі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.radabnr.org/tag/язэп-варонка/. – Дата доступу: 26.11.2018.